***І. В. Соркіна***
*г. Гродна, гімназія № 6*

# МЕТАД «АЖЫЎЛЕННЯ ГІСТОРЫІ» ЯК ЭФЕКТЫЎНЫ СРОДАК РАЗВІЦЦЯ ДАСЛЕДЧЫХ КАМПЕТЭНЦЫЙ НАВУЧЭНЦАЎ

*Прадметам гісторыі з'яўляецца Чалавек.*
*Марк Блок.*

Тэхналогія даследчай дзейнасці навучэнцаў становіцца ўсё больш папулярнай у асяроддзі педагогаў. Праводзяцца шматлікія канферэнцыі і конкурсы даследчых работ навучэнцаў, а таксама навукова-метадалагічныя канферэнцыі, дзе вучоныя абмяркоўваюць шляхі і сродкі развіцця даследчых кампетэнцый вучнёўскай і студэнцкай моладзі. Гэта звязана з тым, што рэалізацыя даследчага навучання садзейнічае вырашэнню шэрагу праблем і задач сучаснай адукацыі: развіццю даследчай кампетэнтнасці, творчага патэнцыялу навучэнцаў і іх вучэбнай матывацыі, прафесійнаму самавызначэнню школьнікаў і інш.

Даследчае навучанне – гэта працэс самастойнага пазнання навучэнцамі навакольнага свету праз вывучэнне яго аб'ектаў, працэсаў і з'яў, арганізаванага і кіруемы выкладчыкам. Вучэбна-даследчая дзейнасць навучэнцаў – гэта рашэнне імі творчай, даследчай задачы з загадзя невядомым вынікам, якая мае на мэце пабудову вучнем суб'ектыўна новых ведаў. Базісам даследчай кампетэнцыі служаць даследчыя здольнасці (уменні), якія праяўляюцца ў даследчых паводзінах навучэнцаў: бачыць праблемы, ставіць пытанні, вылучаць гіпотэзы, даваць вызначэнні паняццяў, класіфікаваць, назіраць, праводзіць досведы, рабіць высновы, структурыраваць матэрыял, тлумачыць, даказваць і абараняць свае ідэі. У працэсе ажыццяўлення даследчай дзейнасці навучэнцы ствараюць новыя для сябе адукацыйныя прадукты (гіпотэзы, метады, сродкі, высновы) і з дапамогай гэтага развіваюць свае творчыя здольнасці. Гэта павышае паспяховасць чалавека ў адукацыі і прафесійнай дзейнасці, паколькі менавіта творчая асоба з'яўляецца больш канкурэнтаздольнай [1, с. 51 – 52].

Эфектыўным сродкам развіцця даследчых кампетэнцый навучэнцаў у працэсе набыцця гістарычных ведаў з'яўляецца зварот да метаду и прыёмаў "ажыўлення гісторыі" як на ўроках гісторыі, так і ў пазакласнай рабоце. У сістэме адукацыі важна і неабходна пашыраць такія навацыі ў сусветнай гуманістыцы, як гуманізацыя гістарычных ведаў, антрапалагізацыя гісторыі. Гэта азначае пашырэнне антрапалагічнага мыслення ў аналізе мінулага з характэрнай для яго ўвагай да прысутнасці

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Чалавека ў гісторыі ва ўсіх праявах (“ачалавечванне гісторыі”, “ажыўленне гісторыі”). Новыя метадалагічныя падыходы дазваляюць падняць праблему Чалавека ў беларускай гісторыі, убачыць у мінулым, у першую чаргу, чалавека з думкамі і пачуццямі і тлумачыць гісторыю праз разуменне матывацыі ўчынкаў людзей, цікавасць да ўнутранага свету людзей гісторыі, зварот да вывучэння не толькі славутых гістарычных асоб, але і так званых “людзей без архіваў”, якіх называюць “маўклівай большасцю гісторыі”. У межах антрапалагічнай гісторыі мінулае ўспрымаецца як цікавы суразмоўца, а яго вывучэнне ператвараецца ў дыялог з мінуўшчынай праз “чалавечае вымярэнне гісторыі” [3, с. 12-13].

“Ажыўленню”, “ачалавечванню” гісторыі садзейнічае мікрагістарычны падыход. Яго сутнасць беларускі гісторык Вячаслаў Насевіч патлумачыў наступным чынам: “Мікрагісторыя ставіць сваёй мэтай аднаўленне суцэльнай карціны ў маштабах аднаго паселішча або мікрарэгіёна, вузкай сацыяльнай групы, а часам нават у маштабе адной сям’і або індывідуальнай біяграфіі. Размова ідзе не пра механічнае складанне адной вялікай гісторыі з мноства дробных, як мазаікі, а хутчэй пра стварэнне люстэрка, з дапамогай якога можна пад новым ракурсам зірнуць на вялікі свет. Ідэя гэтага падыходу грунтуецца на вядомым філасофскім прынцыпе, паводле якога вялікае адбіваецца ў малым, як Сусвет адлюстроўваецца ў кроплі расы. Ідэя мікрагісторыі нагадвае даследаванне асобнай клеткі пад мікраскопам з мэтай лепш зразумець функцыянаванне шматклетачнага арганізма” [2, с. 138].

Антрапалагізацыя гістарычнай навукі і яе арыентацыя на мікраўзроўневыя даследаванні, міждысцыплінарнасць – гэтыя і некаторыя іншыя рысы вызначаюць сёння “новую гістарыяграфію” [5, с. 106].

Пра антрапалагічны паварот у гістарыяграфіі сведчыць таксама зварот да гендарных даследаванняў, гісторыі паўсядзённасці, гістарычнай біяграфістыкі, шырокае выкарыстанне крыніц асабістага паходжання (успамінаў, дзённікаў), вусна-гістарычных крыніц. “Вусная гісторыя” – гэта навуковы накірунак, які даследуе як мінулае, так і асаблівасці сацыяльнай памяці пра яго шляхам запісу, архівізацыі і аналізу інтэрв’ю са сведкамі і/або ўдзельнікамі мінулых падзеяў. Дзякуючы вусна- гістарычным крыніцам мы знаходзім у мінулым новых герояў – звычайных людзей. Можна сцвярджаць, што вусная гісторыя вяртае гісторыю людзям, і яна перадаецца іх уласнымі словамі.

Выкарыстанне гэтых навацый у вучэбна-выхаваўчым працэсе, безумоўна, спрыяе яго ўдасканальванню і павышэнню эфектыўнасці. У якасці асноўных метадычных прыёмаў “ажыўлення гісторыі” на ўроках і факультатыўных занятках па гісторыі, а таксама ў пазакласнай дзейнасці можна вызначыць наступныя:

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

– паглыбленне аналізу дадзеных гістарычнай біяграфістыкі (сям'я, светапогляд, пачуцці, матывы і г. д. – усё, што пралівае святло на гістарычную постаць як на чалавека);

– зварот да крыніц асабістага паходжання (успамінаў, дзённікаў, інтэрв'ю);

– выкарыстанне візуальных крыніц (фатаграфій, карцін, карыкатур, плакатаў, відэа-матэрыялаў і г. д.);

– выкарыстанне матэрыялаў па гісторыі паўсядзённасці, гендарных і мікрагістарычных даследаванняў.

Зварот да метадычных прыёмаў "ажыўлення гісторыі" вельмі важны для эфектыўнага фарміравання і развіцця даследчай кампетэнцыі навучэнцаў на ўроках і факультатыўных занятках па гісторыі, у пазакласнай рабоце, а таксама ў дзейнасці школьных музеяў [4]. Шасцігадовы педагагічны вопыт выкарыстання метаду "ажыўлення гісторыі" паказаў, што, дзякуючы яму павышаецца матывацыя школьнікаў да даследчай дзейнасці, паспяхова развіваюцца даследчыя здольнасці, фарміруюцца веды, уменні і навыкі правядзення ўласных даследаванняў. Акрамя таго, вывучэнне гісторыі роднага краю з дапамогай сродкаў "ажыўлення гісторыі" мае велізарнае патрыятычнае ўздзеянне на навучэнцаў – выхоўвае павагу і любоў да роднай гісторыі і культуры.

## Літаратура


1. Запрудский, Н.И. Технология исследовательской деятельности учащихся: сущность и практическая реализация / Н.И. Запрудский // Фізіка: праблемы выкладання. – 2009. – № 4. – С. 51–57.

2. Насевіч, В. Мікрагісторыя: мінулае ў чалавечым вымярэнні / В. Насевіч // Беларускі гістарычны агляд. – 1999. – Т. 6. Сш. 1–2 (10–11). – С. 133–151.

3. Смалянчук, А.Ф. Антрапалагічная гісторыя і беларуская гістарыяграфія / А.Ф. Смалянчук // HOMO HISTORICUS 2008. Гадавік антрапалагічнай гісторыі / Пад рэд. А.Ф. Смаленчука. – Вільня : ЕГУ, 2008. – С. 11–14.

4. Соркіна, І.В. Развіццё даследчых кампетэнцый навучэнцаў сродкамі музея "Жывая гісторыя горада" / І.В. Соркіна // Адукацыя і выхаванне. – 2020. – № 5 (341). – С. 24–28.

5. Шутова, О.М. Тенденции антропологизации в современной историографии: история повседневности, устная и гендерная истории / О.М. Шутова // Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны. Вып. 1 / рэдкал.: С. М. Ходзін (адк. рэдактар) [і інш.]. – Мінск : БДУ, 2002. – С. 106–121.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ